ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЗНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
20
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 27 (1403)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

Мэлетаўп

• Учора • Сёння • Заўтра •

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, КУЛЬТУРАЙ, ПРАФЕСІЙНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ!

БУДЗЬЦЕ ПАЛЫМЯНЫМІ ПАТРЫЁТАМІ НАШАЙ РАДЗІМЫ, САМААДДАНЫМІ БАРАЦЬБІТАМІ ЗА СПРАВУ ЛЕНІНА, ЗА КАМУНІЗМ!

(З Заклікаў ЦК КПСС)

СПРАВЫ КАМСАМОЛЬСКІЯ

КАСТРЫЧНІК у камсамольскім календары займае асобнае месца. З яго пачынаецца слаўны летапіс Ленінскага камсамола. 29 кастрычніка баявы атрад савецкай моладзі — Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі — адзначае сваё 65-годдзе. Напярэдадні гэтага свята ва ўсіх камсамольскіх групавых арганізацыях БДУ імя У. І. Леніна прайшлі справаздачна-выбарныя сходы. Гэта важная падзея ў жыцці кожнай камсамольскай арганізацыі. Ад таго, наколькі арганізавана, прынцыпова пройдуць справаздачы і выбары ў кожным структурным звяне, залежыць поспех работы падраздзялення на працягу ўсяго года.

Справаздачна-выбарныя сходы закліканы даць глыбокі аналіз усіх напрамкаў дзейнасці камсамольскай арганізацыі, вызначыць новыя рубяжы ў вырашэнні пастаўленых перад ёю задач.

Сёлетнія справаздачы і выбары маюць сваю асаблівасць: яны праходзілі разам з грамадска-палітычнай атэстацыяй, якая дазваляе ацаніць уклад кожнага камсамольца ў грамадскую работу.

Грамадска-палітычная атэстацыя садзейнічае ідэйнаму росту юнакоў і дзяўчат, выхаванню іх сапраўднымі будаўнікамі камуністычнага грамадства. У час правядзення ГПА кожны камсамолец рапартуе аб сваіх поспехах і дасягненнях, аб асабістым укладзе ў выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XIX з'езда ВЛКСМ.

На грамадска-палітычнай атэстацыі і справаздачна-выбарных сходах, якія праходзілі ў нядзелю амаль ва ўсіх групах, прысутнічалі рэктар акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі, сакратар парткома М. Г. Елісееў, намеснік сакратара парткома П. І. Брыгадзін, прадстаўнікі вышэйстаячых камсамольскіх органаў.

У 1984 годзе выйдуць гадзіннікі «Электроніка» з прапанаванымі лабараторыяй хіміі фотапрацэсаў замяняльнікамі каштоўных металаў. Адзін з аўтараў гэтай распрацоўкі—дэлегат III партыйнай канферэнцыі універсітэта Л. С. Цыбульская.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

ГОЛАС ДЭЛЕГАТА

ГРАМАДАЗНАЎЦЫ ВУЧАЦЬ І ВУЧАЦЦА

У перыяд паміж II і III партыйнымі канферэнцыямі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна партыйная арганізацыя, увесь калектыў Інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін ВНУ накіроўвалі свае намаганні на ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў».

Партыйнае бюро інстытута сумесна з дырэкцыяй удзяляла асаблівую ўвагу павышэнню якасці і эфектыўнасці вучэбнага працэсу па розных кірунках: папярэдняя апрабацыя зместу лекцый на кафедрах, арганізацыя ўзаемных наведванняў заняткаў, укараненне ў вучэбны працэс навуковых даследаванняў.

З улікам патрабаванняў пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў» на пасяджэнні партыйнага бюро інстытута і партыйным сходзе усебакова разглядалася пытанне аб развіцці актыўных форм павышэння кваліфікацыі слухачоў. Высветлілася, што ў гэтым напрамку ў інстытуце і на кафедрах складваецца пэўная сістэма: тэарэтычныя і метадычныя семінары, актыўная педагагічная практыка, спецыялізаваныя кансультацыі. Новыя вучэбныя планы даюць для гэтага вялікія магчымасці.

Многія гады ў інстытуце вядзецца вялікая работа па ўзбраенню слухачоў актыўнымі формамі выкладання грамадскіх навук. Гэтым пытанням надавалася вялікая ўвага на партыйных сходах, пасяджэннях партыйных бюро і кафедр. Рэкамендавана рэалізаваць прапанову камуністаў кафедры гісторыі КПСС аб тым, што ў працэсе педагагічнай практыкі адна з лекцый у студэнцкай аўдыторыі павінна чытацца праблемным метадам.

У ходзе рэалізацыі пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў» у інстытуце складваецца новая форма вучэбнага працэсу — арганізацыйна-палітычная работа слухачоў, якая, як адзначаецца ў дадзенай пастанове, павінна «забяспечыць цесную сувязь вывучэння тэарэтычных пытанняў з практыкай камуністычнага будаўніцтва». На справаздачна - выбарных партыйных сходах інстытута і кафедр быў уважліва прааналізаваны пачатковы вопыт гэтай формы вучэбнага працэсу, адзначана шмат станоўчага для павышэння кваліфікацыі слухачоў. Разам з тым падкрэслівалася, што яшчэ непарадзе вялікая работа ў гэтым кірунку.

У цеснай сувязі з усім сказаным, прадметам пастаяннага клопату партыйнай арганізацыі і дырэкцыі з'яўляецца праблема ператварэння ІПК у вучэбна - метадычны цэнтр вышэйшай школы па ўдасканаленню выкладання грамадскіх навук і камуністычнага выхавання.

Тут цэнтральнае месца належыць рабоце па абагульненню і распаўсюджанню перадавога вопыту грамадазнаўцаў ВНУ. За апошнія тры гады мы грунтоўна вывучылі практыку выкладання грамадскіх навук у ВНУ Віцебска, Гомеля, Гродна, Брэста, Магілёва і Мінска. Гэта работа праводзілася планава, па разнастайных найбольш актуальных пытаннях: праблемнае выкладанне, вывучэнне першакрыніц навуковага камунізму, выкарыстанне матэрыялаў XXVI з'езда КПСС у курсах грамадскіх навук. Мерапрыемствы дырэкцыі і партыйнага бюро ІПК па рэалізацыі рашэнняў чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС прадугледжваюць павышэнне эфектыўнасці гэтай работы. Плануецца, напрыклад, правесці ў снежні 1983 года вывучэнне і абагульненне вопыту грамадазнаўцаў ВНУ шэрагу кафедр горада Мінска па тэме: «Выхаваўчая накіраванасць выкладання грамадскіх навук у святле матэрыялаў чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС», а таксама (студзень 1984 г.) навукова - метадычную канферэнцыю па тэме: «Чэрвеньскі Пленум ЦК КПСС і задачы павышэння выхаваўчай функцыі грамадскіх навук».

Паспяховая рэалізацыя адзначаных задач немагчыма без ажыццяўлення кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў, выканаўчай дысцыплінай. Аб выкананні планаў, мерапрыемстваў, пастаноў камуністаў інфармуюць на партыйных сходах інстытута і кафедр, пасяджэннях партыйнага бюро і дырэкцыі. У кожным наборы арганізаваны ўлік прапаноў і крытычных заўваг камуністаў.

Разам з павышэннем патрабаванняў да выканання прынятых рашэнняў у партыйнай арганізацыі падтрымліваецца ініцыятыва камуністаў па развіццю форм унутрыпартыйнага і грамадскага жыцця. Так, па ініцыятыве камуністаў кафедры гісторыі КПСС узнікла настаўніцтва — аказанне тэарэтычнай і навукова - метадычнай дапамогі маладым выкладчыкам з боку вопытных грамадазнаўцаў з ліку слухачоў; камуністы кафедр палітэканоміі і навуковага камунізму сталі ініцыятарамі арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паміж вучэбнымі групамі, па пачыну камуністаў кафедры філасофіі пачалі праводзіцца фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы.

Партыйнае бюро інстытута, карыстаючыся правам кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, ажыццяўляе партыйны ўплыў на рашэнне асноўных пытанняў дзейнасці інстытута. Гэта стварае атмасферу высокай патрабавальнасці, добры маральна-псіхалагічны клімат калектыву ўвогуле.

М. ЛЕНСУ,
сакратар партбюро ІПК, прафесар.

ПРЫЁМ ДЭЛЕГАЦЫІ

Таварыства савецка - польскай дружбы прайшоў у БДУ імя У. І. Леніна. Яна прыбыла ў Мінск у сувязі з 40-годдзем утварэння Войска Польскага. У састаў дэлегацыі ўваходзілі ўдзельнікі бітвы пад Ленінам, афіцэры Войска Польскага, прадстаўнікі польскай моладзі.

Перад гасцямі універсітэта з расказам аб гісторыі ўтварэння БДУ, аб яго міжнародных сувязях выступілі рэктар, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі, прарэктар А. В. Шарапа, сакратар парткома М. Г. Елісееў. Заклік памнажаць традыцыі савецка-польскай дружбы прагучаў у выступленні Героя Савецкага Саюза, удзельніка вызвалення Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў М. Я. Зайцава.

Прысутнічаючыя на сустрэчы прадстаўнікі адміністрацыі, партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыву адказалі на пытанні членаў польскай дэлегацыі, звязаныя з арганізацыяй вучэбнага працэсу, работай грамадскіх арганізацый універсітэта.

У той жа дзень члены польскай дэлегацыі наведалі музей універсітэта, кабінет АТНС, лабараторыі кафедры ядзернай фізікі.

Ю. ВАРАТНІЦКІ.

КУБАК

абласнога савета прафсаюзаў па баскетболу сярод жанчын выйграла каманда універсітэта. У фінальным матчы дзяўчаты перамаглі зборную «Гарызонта», за якую выступалі амаль усе спартсменкі дубліруючага саставу каманды майстроў.

А. ШХІНЬЯН.

ВЫСТАЎКА—ПРОДАЖ

кніг выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна прайшла ў Цэнтральным кніжным магазіне. Тут была прадстаўлена навуковая і вучэбная літаратура мінулых гадоў выдання, а таксама кнігі, якія выйшлі з друку нядаўна.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічалі прадстаўнікі Мінскага аблкнігагандлю і выдавецтва, якія далі кваліфікаваныя адказы на пытанні чытачоў.

А. ЗЯНЬКЕВІЧ.

У СПАРТЫЎНЫЯ СЕКЦЫІ

універсітэта ўліліся дзесяткі першакурснікаў. На агульным арганізацыйным сходзе загадчык кафедры фізвыхавання і спорту С. У. Макарэвіч пазнаёміў іх з перспектывамі развіцця фізкультуры і спорту ў БДУ імя У. І. Леніна.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

● ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ

Формула поспеху— ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ

ІДУЧЫ НА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНУЮ атэстацыю, я не выбірала горшага ці лепшага факультэта. Ішла, як кажуць, «на авось». У камітэце камсамола юрыдычнага факультэта мне параілі:

— Ідзіце ў шостую групу трэцяга курса. Гэта адна з лепшых груп факультэта. Актыўная, дружная. Амаль усе студэнты (за выключэннем тых, хто не можа па стану здароўя) ездзяць у будатрады. Многія ўзнагароджаны значком «Ударнік СБА».

Хацелася напісаць з пазіцыі высокай патрабавальнасці (па рэкамендацыі ж группа адна з лепшых), і неяк цяплей, ці што.

...Студэнты перад атэстацыяй пераконвалі мяне, што ў іх дружная група. Чаму? Узаемаадносіны добрыя. Сумесныя мерапрыемствы? Ды не ў іх справа: можна і мерапрыемствы праводзіць, а быць кожнаму паасобку. Я пагадзілася з гэтым, але ўсё ж паспрабавала дапытацца нешта і аб мерапрыемствах, якія праводзяцца разам і, безумоўна, збліжаюць групу, умацоўваюць калектыў. Толькі ніхто ніякага сумеснага мерапрыемства прыпомніць не мог (акрамя паездкі ў Вільнюс ды сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны). Не пачула нічога суцяшальнага і на атэстацыі. Але не магло так здарыцца, каб больш не было ніякіх калектыўных паходаў, вечароў, сустрэч. Упэўнена толькі ў адным: студэнтам было нецікава на іх, яны не запалі ў іх душы. Але як змагацца з гэтым? Неабходна больш самастойнасці, і перш за ўсё, трэба зацікавіць камсамольцаў грамадскімі справамі. А зрабіць гэта можна толькі прапанаваўшы нешта цікавае, новае, бо тыя мерапрыемствы, які праводзяцца з году ў год па аднаму і таму ж «сцэнарыю», проста надакучылі. І вось тут патрэбны лідэр, які карыстаецца аўтарытэтам і можа ўнесці нешта сваё, новае ў грамадскую работу.

Не, я асабіста не маю нічога супраць камсорга групы Валерыя Струка. На атэстацыі таварышы хораша гаварылі пра яго. Відаць, паважаюць. Толькі неяк нечакана ў Сашы Неабердзіна вырвалася: вучыцца не ў меру сваіх магчымасцей. Можа, лянота, а можа, яшчэ што.

Лянота. Ці павінна яна быць у камсамольскага важака (і, прытым, камуніста) у адносінах да галоўнага свайго абавязку — вучобы? Тут дарэчы адзначыць, што у групе пяць камуністаў. Як ні парадаксальна, а паспяховасць іх, у параўнанні з мінулай сесіяй, знізілася (сярэдні бал групы наадварот, падняўся ўгару). Гэта стала тэмай для прынцыповай размовы на грамадска-палітычнай атэстацыі. Напэўна, справа ў тым, што камуністы групы пасля школы працавалі, некаторыя не годдва, а больш. Школьную праграму ўжо паспелі запамятаваць і зараз вельмі цяжка дагнаць упушчанае. І ўсё ж правільна паставілі пытанне таварышы: «Што здарылася? Чаму знізілася паспяховасць?» Але станоўчага адказу так і не атрымалі. Спасылаліся на грамадскія даручэнні (ДНД, секцыі, гурткі), на сямейныя абставіны. Або наогул гаварылі: «здавальн.» — проста выпадковасць. Толькі ці не залішне многа выпадковасцей? Асабліва з грамадскімі дысцыплінамі: філасофіяй і палітэканоміяй?

Патрэбна спыніцца яшчэ на адным факце — напісанні характарыстык. Вось яна, адна на ўсю групу: «Паступіў, зарэкамендаваў, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, карыстаецца аўтарытэтам сярод таварышаў». І ўсё. Набор агульных слоў і фраз.

— Характарыстыкі агульныя, — зазначыў старшыня атэстацыйнай камісіі дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў А. Я. Глебаў.— Усе на адзін твар і нельга сказаць, чым адрозніваецца Валанчук ад Барысевіч. Толькі пералікам грамадскіх даручэнняў.

Я згодна, ёсць пэўная форма напісання характарыстык. Толькі ўсё ж патрэбна, каб за ёй быў бачны чалавек, яго справы. А бюро групы забылася аб гэтым.

Можна яшчэ пералічваць тыя праблемы, якія ўзніміліся на грамадска-палітычнай атэстацыі ў 6 групе 3 курса юрыдычнага факультэта. І ўсе яны, безумоўна, важныя і надзённыя, патрабуюць неадкладнага вырашэння. Толькі хочацца заўважыць, што неяк пасіўна паводзілі сябе студэнты, нібы размова ішла не пра іх таварышаў. Пытанні ж задавала ў асноўным камісія. Толькі Аляксандр Неабердзін і Валерый Струк неяк спрабавалі ўскалыхнуць групу.

Спадзяюся, што на справаздачна-выбарным сходзе, які прайшоў на наступны дзень, актыўнасць не была «пасіўнай». Мяркую таксама, што аўтарскі позірк на справы групы самі студэнты зразумеюць як спробу дапамагчы ім у актывізацыі грамадскай работы.

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.



НА ЗДЫМКАХ: ідзе атэстацыя ў трэцякурснікаў юрыдычнага факультэта; Аксана Барысевіч — адна з лепшых студэнтак групы.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.



КАМПЕТЭНТНЫ СУБЯСЕДНІК

«СІЛЫ ПАМНАЖАЮЦЦА ВЫКАРЫСТАННЕМ»

«Вучэнне ёсць форма захавання інтэлекту. Таму чалавек павінен вучыцца ўсё жыццё». Гэтымі словамі прафесар Б. Ананьеў падагульніў апошнія псіхалагічныя даследаванні, у якіх сцвярджаецца, што ў дарослых, якія працягваюць навучанне, больш развіты мысленне, памяць, уважлівасць у параўнанні з тымі, хто ўжо не вучыцца. Такім чынам, вядомая прыказка: вучэнне — святло, а невучэнне — цемра набыла навуковае пацверджанне. Праўда, як запаліць, а потым захаваць у сябе святло ведаў, наш карэспандэнт размаўляе з лаўрэатам Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, прафесарам кафедры ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, акадэмікам АН БССР Міхаілам Аляксандравічам ЕЛЬЯШЭВІЧАМ.

— Вучоба — галоўная праца студэнта. Выказванне гэтае зрабілася ўжо прывычным, калі не сказаць — стэрэатыпным. Вам як выкладчыку, напэўна, зразумела, у чым заключаецца асноўная цяжкасць гэтай працы?

— Ва ўзросшым аб'ёме інфармацыі. Яго нават цяжка суаднесці з тым, што атрымліваў у гады вучэння я. Узяць хаця б такое распаўсюджанае паняцце як вектар. Зараз яго, як гэта прынята гаварыць, «праходзяць», калі не памыляюся, у шостым класе сярэдняй школы. Я пачуў пра яго толькі пасля паступлення ў інстытут. Уся складанасць зараз у адборы патрэбных ведаў.

— А вось, дарэчы, ці падзяляеце Вы веды на патрэбныя і не патрэбныя асабіста для Вас!

— Я вылучаю асноўнае, фундаментальнае. Нельга, калі за дрэвамі не бачна лесу. Заўсёды трэба разумець агульную карціну.

— А ці можна вылучыць нейкі мінімум ведаў, з дасягненнем якога маеш права сказаць сабе: «Я — адукаваны чалавек!»

— Думаю, дакладна вызначыць цяжка. Небяспечна. Аднойчы так сказаў. І што далей? Стаяць на месцы? У такім выпадку вельмі хутка прыйдзецца да слова «адукаваны» дадаваць часціцу «не».

Навука мае дзівосную ўласцівасць рухацца наперад, а напрацаваная калісьці адукаванасць — паступова страчваць сваю актуальнасць. Да таго ж, цэняцца не столькі «голыя» веды, колькі здольнасць іх выкарыстоўваць. Нездарма гавораць, што дурань з добрай памяццю поўны думак і фактаў, але не здольны рабіць вывады. А сутнасць у іх.

— І ўсе ж некаторыя лічаць, што веды — гэта якраз тая сфера чалавечай дзейнасці, дзе ніколі не позна даганяць...

— Пра гэта мы ўжо крыху гаварылі. Даганяць, а яшчэ лепш ісці ў нагу з навукай — патрэба надзённая. Я, нягледзячы на ўзрост, не саромеюся сказаць, што вучуся, бо гэта працэс несупынны. Вельмі пажадана, каб ішоў ён з памнажэннем, якое немагчыма без пэўнай базы. Чалавек павінен не толькі жадаць, але і ўмець сачыць за новым, вось што важна. А калі нешта некалі было недавучаным... Пайдзі, разбярыся, што тады новае, што старое. Карацей кажучы, лепш не адкладваць на заўтра тое, што можна (і патрэбна!) вывучыць сёння. Гульня ў «даганялкі» з учарашнім днём ужо мала падобная на сапраўднае вучэнне.

Але ёсць і адваротны бок медаля — павярхоўнае забяганне наперад. Недзе нешта чуў, дзесьці штосьці чытаў і, калі ласка, прымайце новаспечанага знаўцу. А капнеш глыбей — нахапаныя «бліскучыя» веды, як бенгальскі агонь, бліснуць толькі першыя тры мінуты. Не пабаюся паўтарыцца —вельмі важна засвоіць фундаментальныя веды.

— А калі чалавеку ўсё лёгка даецца і яму хочацца ўсё паспець, аб ўсім даведацца! Дарэчы, у гісторыі навукі такіх прыкладаў хоць адбаўляй. Той жа Лейбніц — палітык, гісторык, юрыст, філосаф, матэматык, педагог, дыпламат, падарожнік у адной асобе!

— Дадайце сюды яшчэ Ламаносава, Максвэла і многіх іншых, зрабіўшых значны ўклад у розныя галіны навукі. Але трэба памятаць, што нават у той час, калі яшчэ не было дакладнай дыферэнцыяцыі, такая рознабаковасць не з'яўлялася правілам. А сёння... Чым далей, тым больш цяжка быць энцыклапедыстам.

Зразумела, чалавеку хочацца зрабіць як мага больш, найлепшым чынам выкарыстаць усе магчымасці. Мне здаецца, я зараз разумею, што мог бы працаваць эфектыўней, і шкада, што часам атрымліваецца не так, як плануецца. Іменна таму сёння, як ніколі раней, важна ўменне сканцэнтравацца на галоўным. Таленавітыя маладыя людзі часам «раскідваюцца», не могуць прымусіць (так, так, нават прымусіць) сябе засяродзіцца на нечым адным, асноўным.

— Аднак у наш час людзі ўсё часцей на працягу жыцця мяняюць прафесіі. Існуе думка, што ў недалёкім будучым гэта з выключэння стане правілам — вытворчасць будзе мяняцца так хутка, што чалавеку прыйдзецца некалькі разоў перавучвацца. Што Вы думаеце на конт гэтага?

— Тое, што не трэба блытаць ліхаманкавую мітусню ад адной спецыяльнасці да другой з працай на грані сумежных дысцыплін. Будучыня — за апошняй. А чалавек, якому ўсё лёгка даецца і які «здымае вяршкі» з усяго, што трапляецца пад руку, рызыкуе згубіць і тое, што мае.

— І апошняе пытанне. Мы размаўлялі сёння аб ведах і шляхах да іх, але па нейкай двухбаковай згодзе абыходзілі маўчаннем адну не зусім прыемную, але даволі распаўсюджаную з'яву — нежаданне вучыцца. Адкуль яно з'яўляецца і як яму процістаяць?

— Чаго граха таіць, хапае яшчэ людзей недапытлівых, тых, што на словах гатовы горы звярнуць, а на справе... Лянівыя заўсёды жадаюць зрабіць нешта вялікае. І не менш. Але ім заўжды не хапае зацікаўленасці. Актыўнай. Творчай. З якой усё пачынаецца і ўсё губляецца, калі яна знікае. Размова ідзе не аб павярхоўным інтарэсе, а аб такім, які прымушае глыбей і шырэй унікаць ва ўсё, што спачатку даецца табе выкладчыкам, а потым даследуецца самастойна. Падобны інтарэс не ўзнікае сам сабой, ён назапашваецца паступова у працэсе работы, і не трэба берагчы свае сілы ў надзеі аднойчы «выкласціся» і зрабіць нешта значнае. Ад выкарыстання сілы толькі памнажаюцца. А значнае... Чалавеку ўласціва імкнуцца іменна да яго. На жаль, у гэтым імкненні не ўсе своечасова разумеюць, што яно, перш за ўсё, рэзультат дзеяння. Што ж датычыцца нежадання вучыцца, дык, шчыра кажучы, у мяне ніколі не ўзнікала пытання, чым займацца, я заўсёды думаў, чым мне лепш заняцца. Працуйце, каб было цікава, а калі з'явіцца цікавасць — жаданне зразумець больш і лепш не прымусіць сябе доўга чакаць.

Гутарыла Н. КАЛІШЭВІЧ,
наш кар.

КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР — КП

НА ПРАЦЯГУ мінулага навучальнага года мне давялося ўзначальваць штаб «КП» біялагічнага факультэта. Неўзабаве адбудзецца справаздачна-выбарны камсамольскі сход студэнтаў-біёлагаў. Напярэдадні гэтага мерапрыемства хацелася б падзяліцца некаторымі сваімі думкамі і меркаваннямі. Наш штаб «КП» пачаў дзейнічаць у лістападзе 1982 года. Вельмі адчувальнай была спачатку недастатковасць вопыту работы. Не хапала ўмення арганізаваць дзейнасць усіх сектараў штаба, дабіцца зладжанай работы. Вялікай памылкай было тое, што новы састаў штаба не фарміраваўся мною, як будучым яго старшынёй. У выніку ў штабе разам з актыўнымі, добрасумленнымі студэнтамі апынуліся і выпадковыя людзі. Усяго за справаздачны перыяд намі праведзена 35 рэйдаў-праверак (для параўнання: у мінулым годзе — 14. Але ж на гістфаку — звыш 100! Відаць, можна і патрэбна працаваць яшчэ актыўней). З гэтых 35 рэйдаў амаль палова — па кантролю за паспяховасцю і вучэбнай дысцыплінай. Добра працавала адказная за акадэмічны сектар Ірына Пінчук. Яна здолела ўстанавіць цесны кантакт з вучэбна-выхаваўчай камісіяй. Добрасумленна адносіўся да сваіх абавязкаў і Аляксандр Ільчанка, які кіраваў жыллёва-бытавым сектарам. Сумесна са студсаветам інтэрната № 8 было ажыццёўлена 7 праверак санітарнага стану і грамадскага парадку. А вось Алег Мялешка быў пасіўны і не жадаў працаваць як след. Таму не заўсёды аператыўна і па свежых слядах выходзілі нумары «КП». Давялося вызваліць Мялешку ад абавязкаў.

НАСУСТРАЧ СПРАВАЗДАЧЫ

Некалькі рэйдаў мы праводзілі разам са штабам «Камсамольскага пражэктара» факультэта радыёфізікі і электронікі. Жывём і вучымся мы побач, таму і многія нашы запатрабаванні і заданні агульныя. Разам жа і працуецца весялей.

Хочацца пажадаць новаму саставу штаба ўдзяліць асаблівую ўвагу эфектыўнасці сваіх рэйдаў. І ў першую чаргу — насценнаму друку. Кожны нумар «КП» павінен мець дакладную ідэйную накіраванасць, прапагандаваць перадавы вопыт, смела крытыкаваць недахопы, даваць прапановы па іх ліквідацыі. Выпускі «КП» павінны адлюстроўваць найбольш вострыя, надзённыя праблемы студэнцкага жыцця. Друк «КП» павінен вылучацца глыбокім зместам, цікавымі рубрыкамі і матэрыяламі, высокім ўзроўнем афарміцельскай тэхнікі. Недапушчальнымі з'яўляюцца абыякавыя адносіны да сатыры і гумару, падмена прынцыповай крытыкі выскаляннем, публікаванне матэрыялаў, якія не маюць грамадскай цікавасці. Значнай памылкай было і тое, што мы не адразу ўстанавілі сувязь з групай народнага кантролю факультэта. А працаваць сумесна з ГНК значна лягчэй.

У заключэнні хочацца спыніцца на адной нявырашанай праблеме. У нашым вучэбным корпусе няма гардэробшчыкаў. Рэчаў з гардэроба знікла нямала. Матэрыялы праверкі штаба «КП» і ГНК факультэта былі накіраваны ў адміністратыўна-гаспадарчую частку. Каменданта корпуса запэўніў, што з новага навучальнага года гардэроб будзе працаваць нармальна. Але з пачатку заняткаў прайшло нямала часу, а гардэробшчыкаў усё няма. Было б добра, каб у сваёй рабоце новы штаб «КП» звярнуў увагу і на гэта.

М. ГАЎРЫЛІН,
старшыня штаба «КП» біялагічнага факультэта.

Каментарый ЛІХТАРЫКА.
Хацелася б, каб сённяшняе выступленне на старонках газеты М. Гаўрыліна дало пачатак абмеркаванню праблем дзейнасці штабоў і пастоў «КП».

СВЯТА НАШЫХ СЯБРОЎ

У ПАЛАЦЫ культуры Мінскага аўтамабільнага завода адбыўся святочны вечар, прысвечаны 21-й гадавіне рэвалюцыі 26 верасня, 20-й гадавіне рэвалюцыі 14 кастрычніка і 5-й гадавіне ўтварэння Йеменскай сацыялістычнай партыі.

НА ЗДЫМКАХ: йеменскіх студэнтаў віншуе намеснік дэкана факультэта па навучанню замежных студэнтаў В. С. Клімовіч; удзельнікаў святочнага вечар вітае ансамбль пантамімы «Рух» Мінскага аўтазавода.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

—КАФЕДРЫ ГЛЕБАЗНАЎСТВА І ГЕАЛОГІІ— 50 ГАДОЎ

ПОШУК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У 1933 ГОДЗЕ пры Беларускім дзяржаўным універсітэце была арганізавана першая ў рэспубліцы кафедра глебазнаўства. Ініцыятарам і першым яе загадчыкам быў вядомы вучоны-глебазнаўца, акадэмік АН БССР, дырэктар Інстытута аграглебазнаўства і агрохіміі Я. М. Афанасьеў. Дзякуючы стварэнню кафедры вырашаліся многія задачы, пастаўленыя перад народнай гаспадаркай першай пяцігодкай, і перш за ўсё — задача падрыхтоўкі кадраў для сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчай навукі.

З першых дзён кафедра становіцца не толькі вучэбным, але і навуковым цэнтрам глебазнаўства рэспублікі. Яе супрацоўнікі разам з вучонымі Акадэміі навук БССР актыўна ўключыліся ў вывучэнне і картаграфаванне глеб Беларусі і прылягаючых абласцей РСФСР і Украіны. Разам з экспедыцыямі праводзяцца першыя палявыя даследы па павелічэнню прадукцыйнасці глеб, выпрабаванню спосабаў іх апрацоўкі і аховы. Аб гэтым сведчыць пералік тэм, якія выконваліся тады пад кіраўніцтвам Я. М. Афанасьева: «Як павысіць ураджайнасць на глебах БССР», «Матэрыялы да аграхімічнай характарыстыкі глеб», «Схемы даследаў па паглыбленню ворнага гарызонту» і іншыя. Многія з гэтых работ маюць вялікі навуковы інтарэс і сёння.

У пасляваенны час кафедра аднавіла работу на геаграфічным факультэце. Загадчыкам яе быў вядомы глебазнаўца, геолаг і географ Ф. М. Дамінікоўскі. Тэматыка кафедры становіцца больш геаграфічнай. У 1947—1948 гадах упершыню арганізуецца вялікая экспедыцыя па комплекснаму вывучэнню прадукцыйных сіл Палескай нізіны. Узначаліў экспедыцыю акадэмік АН БССР І. С. Лупіновіч. У ёй прынялі ўдзел таксама выкладчыкі М. П. Булгакаў, В. І. Пашын, З. М. Дзянісаў і група студэнтаў. Па выніках даследаванняў было напісана 10 навуковых работ, складзены глебавыя карты сярэдняга цячэння р. Прыпяць, якія потым выкарыстоўваліся пры распрацоўцы генеральнай схемы асваення Палесся.

У 1951 годзе кафедру ўзначаліў віцэ-прэзідэнт АН БССР, акадэмік Акадэміі навук БССР І. С. Лупіновіч. На кафедры працавалі прафесары І. Р. Маісееў, А. Р. Мядзведзеў, дацэнт А. Н. Андрушчанка, асістэнт А. М. Папова і іншыя. Супрацоўнікі кафедры і студэнты (потым вядомыя вучоныя) Т. А. Раманава, Г. Ф. Кулеш, В. П. Мотуз і іншыя сумесна са спецыялістамі Белгіправодгаса прынялі ўдзел у складанні «Схемы асушэння і асваення Палескай нізіны». Па выніках даследавання за 1951—1955 гады было апублікавана звыш 60 навуковых работ, у тым ліку 7 манаграфій.

Пачынаючы з сярэдзіны 50-х гадоў, супрацоўнікі і студэнты кафедры актыўна ўключаюцца ў правядзенне буйнамаштабных даследаванняў глеб калгасаў і саўгасаў рэспублікі. Гэтыя работы асабліва пашырыліся пасля 1957 года, калі пры кафедры быў арганізаваны глебавы атрад, які ўзначальвалі спачатку А. М. Папова, а затым А. І. Варчэня. За дванаццаць гадоў работы атрадам даследавана і закартаграфавана звыш 500 тысяч гектараў глеб Беларусі і каля 1 млн.— Алтайскага краю і Сібіры. У гэты час пры непасрэдным удзеле супрацоўнікаў кафедры ўпершыню ў Беларусі распрацавана і выдадзена «Кіраўніцтва па правядзенню дэталёвых даследаванняў глеб», выйшлі ў свет манаграфіі «Глебы БССР», «Глебавыя даследаванні ў БССР» і іншыя.

У 1960 годзе кафедра атрымала назву глебазнаўства і геалогіі. Праз два гады тут ствараецца навукова-даследчая лабараторыя «Біягеахімія глеб». Яе першыя супрацоўнікі А. Г. Міснік, Г. П. Дубікоўскі, Н. А. Гецэвіч і іншыя займаліся даследаваннем мікраэлементнага саставу глеб, вады, раслін, распрацоўвалі прыёмы выкарыстання мікраэлементаў. У выніку ўпершыню былі складзены картасхемы ўтрымання асноўных мікраэлементаў у глебах Беларусі. Па біягеахімічнай тэматыцы супрацоўнікамі абаронена 12 кандыдацкіх і 1 доктарская дысертацыі. Распрацаваны і паспяхова чытаюцца спецкурсы «Геахімія ландшафтаў», «Асновы агрохіміі», «Геаграфічныя асновы меліярацыі», па якіх напісаны вучэбныя дапаможнікі.

У 60-я гады на кафедры паспяхова развіваўся геалагічны напрамак, калі ў навуковай рабоце ўдзельнічалі такія відныя геолагі, як акадэмік АН БССР А. С. Махнач, прафесары Д. М. Карулін, Г. А. Кісялёў, дацэнты Л. М. Вазнячук, С. А. Ціханаў. За гады работы Д. М. Карулінам напісана каля 10 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па геалагічных дысцыплінах. У той жа час шырокае развіццё атрымала эканамічная ацэнка (банітаванне) зямель, якая распрацоўвалася членам-карэспандэнтам АН БССР прафесарам А. Р. Мядзведзевым, які ўзначаліў кафедру ў 1968 годзе. Па гэтай тэме ім разам з супрацоўнікамі інстытута глебазнаўства і агрохіміі напісаны 2 манаграфіі, звыш 30 артыкулаў. Працягваюцца работы па даследаванню і картаграфаванню глеб рэспублікі, за якія прафесар А. Р. Мядзведзеў, у ліку іншых глебазнаўцаў, у 1976 годзе ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР. Распрацаваны і чытаецца спецкурс «Методыка палявых глебавых даследаванняў і аптымізацыя глеб», на высокім навукова-педагагічным узроўні праводзяцца вучэбныя і вытворчыя практыкі, базамі якіх з'яўляюцца вядучыя ўстановы і арганізацыі адпаведнага профілю.

Навуковая тэматыка кафедры цесна звязана з запытамі сельскай гаспадаркі. Улічваючы небывалыя маштабы меліярацыйных работ у Беларусі, апошнія дзесяць гадоў у навуковых даследаваннях пераважае меліярацыйная тэматыка. Па некаторых напрамках кафедра стаіць на перадавых пазіцыях не толькі ў рэспубліцы, але і ў краіне.

Супрацоўнікі падраздзялення ўдзельнічаюць у распрацоўцы і экспертызе буйнейшых праектаў меліярацыйнага пераўтварэння прыроды рэспублікі. Сумесна з праблемнай лабараторыяй меліярацыі ландшафтаў імі паспяхова выконваюцца дзве важнейшыя тэмы, а атрыманыя вынікі абагульняюцца ў практычных рэкамендацыях, выкарыстоўваюцца пры чытанні спецкурсаў, напісанні дысертацый. Толькі за апошнія 30 гадоў на кафедры падрыхтавана і абаронена больш за 50 дысертацыйных работ. Зараз паспяхоза працуюць 4 аспіранты. Усе студэнты, што спецыялізуюцца на кафедры, удзельнічаюць у навуковых даследаваннях. Аб іх выніках яны сістэматычна паведамляюць на пасяджэннях навуковага гуртка, які працуе пры кафедры ўжо больш за 25 гадоў.

Кафедрай глебазнаўства і геалогіі наладжаны цесныя кантакты з акадэмічнымі і галіновымі навуковымі ўстановамі рэспублікі. У вучэбнай і навуковай рабоце прымаюць удзел вядучыя вучоныя—акадэмік АН БССР і УАСГНІЛ С. Г. Скарапанаў, акадэмік УАСГНІЛ Т. М. Кулакоўская, акадэмік АН БССР Р. Г. Гарэцкі, член-карэспандэнт АН БССР А. І. Івіцкі, доктары навук Т. А. Раманава, У. В. Жылко і іншыя.

Арганізаванасць і добрасумленныя адносіны да работы супрацоўнікаў кафедры дазволілі дасягнуць высокіх рэзультатаў у сацыялістычным спаборніцтве. У апошнія гады кафедра пастаянна выходзіць пераможцай сярод дзевяці падраздзяленняў геаграфічнага факультэта. Свой юбілей кафедра глебазнаўства і геалогіі сустракае значнымі дасягненнямі ў вучэбна-выхаваўчай і навуковай рабоце.

В. АНОШКА,
загадчык кафедры, дацэнт.
У. СТЭЦКО,
дацэнт.

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ В. З. ХАРУЖАЙ

«ЗАЎСЁДЫ ВАША... КАМСАМОЛКА»

У АДНЫМ З ПІСЬМАЎ на волю Вера Харужая вітала беларускі камсамол сардэчнымі словамі: «Камсамол, камсамол! Не пяць, а пятнаццаць, пяцьдзесят гадоў бяссільны вырваць з маёй памяці гэтыя ўспаміны, бяссільны прымусіць мяне забыць аб тым, што камсамол зрабіў мяне бальшавічкай, выхаваў, загартаваў, навучыў не толькі змагацца, але і любіць рэвалюцыйную барацьбу больш за ўсё, больш за жыццё». Гэта пісала не дзяўчынка, якой круціў галаву хмель маладосці і юначага шчасця. Словы ўдзячнасці Ленінскаму камсамолу адрасаваў вопытны рэвалюцыянер і падпольшчык, сакратар ЦК камсамола Заходняй Беларусі, член ЦК камсамола Польшчы, член ЦК КПЗБ.

Да таго часу В. Харужая прайшла сур'ёзную школу рэвалюцыйнай барацьбы, этапамі якой былі Кастрычніцкая рэвалюцыя, грамадзянская вайна, цяжкія першыя гады Савецкай улады. Тады і загарэлася зорка яе лёсу — яна ўступіла ў камсамол, «родную і любімую маладую гвардыю». Усё жыццё Харужая ганарылася сваёй прыналежнасцю да камуністычнага саюза, укладвала ў яго справы сілы і энергію. Разам з камсамолам яна ўступіла на шлях сацыялістычнай перабудовы грамадства і адначасова ўбачыла ў моладзі сілу, здольную ўдзельнічаць у дасягненні гэтай мэты.

У камсамоле В. Харужая засвоіла навуку жыцця і барацьбы, навучылася разумець сутнасць сацыяльных пераўтварэнняў, атрымала бальшавіцкую загартоўку. Рэвалюцыя дала такі велізарны зарад энергіі, што яго хапіла камсамолцы на ўсё жыццё і на жорсткую і ўпартую барацьбу, хаця ў лёсе В. Харужай гэтыя паняцці нераздзельныя: яе жыццё — барацьба.

Ідэяй барацьбы Харужая была апантана. Гэта стала патрэбнасцю, арганічнай часткай яе істоты. Рэвалюцыйнай, грамадскай рабоце яна прысвяціла ўсё сваё жыццё. Смела паяўлялася дзяўчына ў самых аддаленых вёсках, калі агітатарам пагражалі кулакі і бандыты. Яна растлумачвала палітыку партыі і Савецкай дзяржавы, прапагандавала камсамольскія лозунгі аб'яднання рабочасялянскай моладзі. Што давала ёй сілы? Упэўненасць у карысці сваёй работы, задаволенасць тым, што працоўная моладзь актыўна падтрымлівае Савецкую ўладу, пачуццё салідарнасці з таварышамі па камсамольскай арганізацыі. Законам яе камсамольскіх паводзін была асабістая адказнасць за кожную справу, а незаспакоенасць — звычайным станам душы. Яна лічыла, што маладосць павінна настойліва пераадольваць цяжкасці.

Рэвалюцыйная страснасць і шырокі палітычны кругагляд, упартасць у рабоце вызначалі Харужую. Яна настойліва вучылася, была прапагандыстам, супрацоўнікам маладзёжнага друку, выхаваўцай у юначай камуне. Прага дзейнасці яе перапаўняла. Таму абсалютна заканамерным з'яўляецца тое, што ў дваццаць гадоў В. Харужая зрабіла такі адказны крок у сваім жыцці — добраахвотна пакінула родных, сяброў, мірнае жыццё і пайшла на падпольную работу ў Заходнюю Беларусь.

У КСМЗБ В. Харужая становіцца кіраўніком, адказным работнікам. Гэта ўскладае на яе новыя абавязкі. Яна была ў адказе за падпольную арганізацыю, яе шматгранную рэвалюцыйную дзейнасць, за жыццё людзей. Рэвалюцыйнай справе В. Харужая аддавала ўсю сваю энергію, любоў, жаданне змагацца за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Яна выхоўвала ў моладзі класавую свядомасць, нянавісць да фашысцкай дыктатуры. У яе характары з асаблівай сілай выявіліся стрыманасць і наступальнасць. В. Харужая заўсёды імкнулася быць сярод людзей. Яна нагружала сябе работай і ў ёй знаходзіла задаволенасць. У той жа час у яе была развіта крытычная самаацэнка сваіх дзеянняў і ўчынкаў. Яна заўсёды лічыла, што працуе недастаткова, патрабавала энергічнасці ад сваіх таварышаў, вучыла іх не шкадаваць ні сіл, ні часу для работы і сама была ў гэтым прыкладам. Яе паплечнікі па барацьбе называлі Харужую «байцом па прызванню, на натуры, па саставу крыві».

Мужнасць Веры Харужай выцякала з глыбокай упэўненасці ў справядлівасць і неабходнасць барацьбы. Праз яе сэрца праходзілі пакуты прыгнечаных людзей, ганенні і пакаранні рэвалюцыянераў абавязвалі яе да яшчэ больш упартай барацьбы. «Я сяджу за тое, у што палымяна веру, — пісала яна з турмы. — У мінулым у мяне два гады энергічнай, поўнай агню, плённай работы, наперадзе — бліскучая ўсімі сонцамі свету свабода і зноў праца...» Такая светлая надзея жыла ў ёй, нягледзячы на васьмігадовы прыгавор буржуазнага суда, насільнае адлучэнне ад рэвалюцыйнай работы, ад жывога ўдзелу ў справах камсамола і партыі.

Моцная воля В. Харужай, перакананасць камуніста прыводзілі ў замяшанне фашысцкія ўлады. «Турэмнае зняволенне, як бы доўга яно ні цягнулася, і цяжкі лёс, які яе чакае, — яе не страшаць...» — гаварылася ў прыгаворы суда.

У турме В. Харужая напісала «Пісьмы на волю», якія сталі своеасаблівай палітычнай справаздачай перад таварышамі па барацьбе. У той жа час гэты дакумент раскрывае радасць душы рэвалюцыянера, які не толькі з гонарам і годнасцю выканаў свой абавязак, але і ўсяляе веру ў іншых. «...Жыццё — цудоўная рэч. Жыць, каб змагацца. Жыць, каб быць байцом, смелым і моцным!» У гэтай сціслай формуле было крэда жыцця Веры Харужай. Такімі паэтычнымі вобразамі насычаны «Пісьмы на волю» — твор вялікай публіцыстычнай сілы, шырокіх мабілізуючых магчымасцей.

Гераічнае жыццё В. Харужай яркай старонкай увайшло ў гісторыю камсамола. Жыццё і дзейнасць Веры Харужай дапамагае выхоўваць падрастаючае пакаленне ў духу ідэйнай перакананасці, адданасці справе камунізму.

А. СЛУКА,
дацэнт, кандыдат гістарычных навук.

Леанід ТРУБАЧ

СОН

— Бабулька! Мой сон разгадай!
Я ж ведаю — ты чараўніца!
Бэзу пах галаву закружыў,
Пра ўсё я паспела забыцца.
Незнаёмец мяне цалаваў,
У вачах пацямнела да рання.
Абдымаў ён, пра нешта шаптаў
І кружыў на руках
да світання!
— Ой унучка! Скажу я адно!
Закахаешся, дзеўка, не болей!
Атрымаецца воляй-няволяй...
Не бойся! Чырванееш чаго!

ВОСЕНЬСКІ НАДВЯЧОРАК.

Фотаэцюд С. ПЛЫТКЕВІЧА.

СПАБОРНІЦТВА НА ПРЫЗ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

ПЕРШАКУРСНІК, ХТО ТЫ?

ГЭТАЕ ПЫТАННЕ задаюць многія. Усім хочацца даведацца, што за папаўненне прыйшло ва універсітэт. Цяпер яно хвалюе спартыўны клуб і кафедру фізвыхавання і спорту. І будзеце вы, паважаныя першакурснікі, адказваць на пытанне ў нядзелю, 23 кастрычніка, у час спаборніцтваў на прыз газеты «Беларускі універсітэт».

Спаборніцтвы на кубак першых курсаў па бегу праводзяцца ўжо чатыры гады. Вось хто ім уладаў:

1979 г. — хімфак,
1980 г. — журфак,
1981 г. — гістфак,
1982 г. — журфак.

Спаборніцтвы - рэкардсмены — так можна назваць старты першакурснікаў, бо яны самыя масавыя. Кожны можа прыняць удзел у іх. Факультэт мае права выстаўляць увесь курс, у залік жа ідзе палавіна рэзультатаў.

Калі гаварыць аб асабістых рэзультатах, то прывядзём імёны спартсменаў, якія займалі першыя месцы. У хлопцаў гэта І. Вараб'ёў (юрфак), А. Чарняхоўскі (факультэт радыёфізікі і электронікі), А. Міхейкін (ФПМ), Ю. Шаўцоў (юрфак). Рэкордам кубка з'яўляецца рэзультат І. Вараб'ёва, які прабег кіламетровую дыстанцыю за 2 мінуты 43 секунды. Гэты рэкорд пакуль трымаецца. У дзяўчат у 1981 годзе А. Пількова (фізфак) паказала 1 мінуту 22 секунды. А мінулы раз А. Трахаўцова (хімфак) пераадолела 500 метраў таксама за 1 мінуту 22 секунды. Першымі пераможцамі кубка сталі С. Карпава (гістфак) і А. Лебедзь (ФПМ).

— Кубак першых курсаў па бегу адкрывае спартыўныя спаборніцтвы ва універсітэце,— гаворыць старшыня праўлення спортклуба А. С. Балдзін.— І не выпадкова. Ён з'яўляецца аглядам спартыўнага папаўнення. Асабліва гэта важна для факультэтаў, бо можна ўбачыць, хто на што здольны. Справа не толькі ў перамогах. Масавасць, упартая барацьба пераварае старты ў свята.

Так, справа не ў перамогах дарагі першакурснік. Праяві сябе, дакажы, што твой курс лепшы. Акрамя пераможцаў, у прызёрах былі першыя курсы фізфака, юрфака, ФПМ, мехмата. Не будзем загадваць наперад, няхай да апошняга старта будзе незразумела, хто выйграе, хто ўздымецца на вышэйшую ступеньку п'едэстала гонару. Няхай кожны з удзельнікаў ўстановіць свой асабісты рэкорд. На старт!..

У. АБРАМОВІЧ.

ПІСЬМЫ З ЛЕТА

ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ, НАРАЧ!

ХУТКА ПРАЛЯЦЕЛА ЛЕТА! Яно яшчэ доўга будзе нагадваць аб сабе добрымі ўспамінамі. І асабліва тым, хто правёў свае студэнцкія канікулы на чароўным беразе возера Нарач у спартыўна-аздараўленчым лагеры універсітэта. За тры лагерныя змены тут адпачыла звыш 500 чалавек, сярод іх вялікая група замежных студэнтаў.

Раніцой, у восем гадзін, гучыць бадзёры голас: «Па лагеры аб'яўляецца пад'ём». А праз некалькі хвілін з домікаў выбягаюць вясёлыя юнакі і дзяўчаты. Пад кіраўніцтвам трэнера робім зарадку і, схапіўшы ручнікі, бяжым на возера. А калі зарад бадзёрасці атрыманы, то можна праводзіць самыя разнастайныя мерапрыемствы. Акрамя студэнтаў, якія прыехалі ў лагер каб проста адпачыць і загартаваць сваё здароўе, тут было нямала спартсменаў, якія рыхтаваліся да адказных спаборніцтваў і таму кожны дзень праводзілі трэніроўкі. Іменна яны з'явіліся завадатарамі многіх добрых спраў.

Германа Маскаленку можна было ўбачыць усюды: на валейбольнай пляцоўцы і футбольным полі, на сцэне і ў бібліятэцы, на рыбалцы. За што ні браўся Герман, усё рабіў з душою, з нязгасным аптымізмам. Гледзячы на яго, самому хацелася прыняць удзел, нават у тым, у чым ніколі не спрабаваў сябе. А Сяргей Дубінін нікога не пакінуў абыякавым да танцаў. Дзяўчаты, якія займаюцца мастацкай гімнастыкай, вырашылі дапамагчы яму. Бачылі б вы, якія танцы яны паказвалі на канцэртах!

Гэтыя студэнты былі не проста лідэрамі ўсіх спраў. Яны з'яўляліся першымі памочнікамі камандзіраў і выхавацеляў атрадаў. Шмат цікавых мерапрыемстваў прайшло ў лагеры. Гэта навуковыя канферэнцыі, конкурсы палітычных плакатаў і насценных газет, мастацкай самадзейнасці, спаборніцтвы па футболу, мнагабор'ю ГПА, тэнісу. Цікава праходзіла тэатралізаванае свята Няптуна, надоўга запомняцца экскурсіі на Блакітныя азёры і партызанскія базы.

Зараз, калі пачаўся новы навучальны год, мы, студэнты, гаворым вялікае дзякуй усім выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта, якія дапамаглі нам цікава арганізаваць свой адпачынак. Надоўга запомняцца ласкавыя хвалі Нарачы, вясёлае сонейка і шчаслівыя ўсмешкі новых сяброў.

Да сустрэчы, чарадзейнае возера Нарач!

А. ДАНІЛЬЧАНКА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

20 кастрычніка 1983 г.

Зак. 1765 АТ 04492

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ